УДК 930(476)

# БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ У XX ст. У СІНТЭТЫЧНЫХ ВЫДАННЯХ ПНР (на прыкладзе «Гісторыі Беларусі» Марцэлі Космана)

**Цымбал Аляксандр Георгіевіч**
дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры
і турызму ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны
лінгвістычны ўніверсітэт»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

*Артыкул прысвечаны аналізу наратыву беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. у адзіным сінтэтычным выданні па гісторыі Беларусі (аўтар Марцэлі Косман), выдадзеным у Польскай Народнай Рэспубліцы.*

*Даследаванне выканана пры падтрымцы БРФФД у рамках навуковага праекта Г20Р-011 «Сучаснае замежнае гістарычнае беларусазнаўства: эвалюцыя метадалагічных падыходаў і ацэнак».*

Даследаванне гісторыі Беларусі даўно не з'яўляецца выключнай сферай інтарэсаў беларускіх гісторыкаў. Гістарыяграфічныя школы суседніх краін сфарміравалі свае падыходы і погляды на вывучэнне разнастайных праблем беларускай гісторыі. Сучаснае даследаванне па гісторыі Беларусі немагчыма ўявіць без аналізу замежнай гістарыяграфіі, у прыватнасці Польшчы. Малавядомымі ў Беларусі застаюцца навуковыя погляды і канцэптуальныя мадэлі, з дапамогай якіх ствараецца вобраз краіны ў польскай гістарыяграфіі. Яшчэ менш мы ведаем аб дыскусіях у асяроддзі польскіх гісторыкаў, якія датычацца беларускіх зямель.

У гістарычнай навуцы Польскай Народнай Рэспублікі гісторыя Беларусі не з'яўлялася папулярным накірункам даследаванняў. Ідэалагічныя абмежаванні, складаныя праблемы агульнай гісторыі і вызначэння беларуска-польскай граніцы не спрыялі папулярнасці накірунку «беларускіх даследаванняў». У польскай гістарычнай літаратуры вобраз Беларусі цесна звязаны з паняццем «крэсаў», якое мае выразна экспансіяністкія канатацыі. Імкненне не ўздымаць праблемныя пытанні беларуска-польскіх адносін прывяло да таго, што даследаванні гісторыі Беларусі XX ст. амаль не праводзіліся. Яшчэ больш рэдкай справай было выданне сінтэтычных ці абагульняючых выданняў, прысвечаных гісторыі беларускай дзяржавы і народа. Адзінай публікацыяй такога роду з'яўляецца праца Марцэлі Космана «Гісторыя Беларусі», выдадзеная ў Вроцлаве ў 1979 г. [1, с. 178].

Марцэлі Косман – вядомы польскі гісторык, вучань выбітнага польскага гісторыка Г. Лаўмянскага, на час выдання працы з'яўляўся дырэктарам Навуковага архіву Акадэміі навук у Курніку (Вялікапольскае ваяводства). Асноўная сфера яго навуковых інтарэсаў датычылася рэлігійнай гісторыі і гісторыі дыпламатыі Вялікага Княства Літоўскага.

Спроба сінтэтычнага прадстаўлення гісторыі Беларусі ў ПНР сустрэла рэзкую крытыку рэцэнзентаў натуральна па ўсім свеце. Так, у часопісе «*The Polish Review*», які выдаваў Польскі інстытут мастацтваў і навук у Амерыцы, у рэцэнзіі М. Сякерскі з Каліфарнійскага ўніверсітэту Берклі адзначаў, што кніга стане расчараваннем для тых, хто вывучае гісторыю Беларусі [2, с. 178]. Выданне мела значную колькасць памылак, змаўчанняў, шматлікіх запазычанасцей з савецкіх падручнікаў.

Выданне сустрэла вялікую крытыку і ў самой Польшчы. Значная частка выдання прысвечана перыяду Вялікага Княства Літоўскага, але, як адзначалі рэцэнзенты, прапанаваны Косманам тэкст быў ужо вядомы дзякуючы сінтэзу з гісторыі Літвы Е. Ахманьскага. Чакалася, што істотным укладам у пазнанне мінулага Беларусі павінна стаць характарыстыка найноўшай гісторыі, але гэты перыяд быў прадстаўлены вельмі слаба [3, с. 178].

Нарыс гісторыі Беларусі М. Космана пабудаваны на двух падыходах, запазычаных з савецкай гістарыяграфіі: па-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

першае – гэта сцвярджэнне, што гістарычная Беларусь цалкам супадае з БССР, і па-другое, што гісторыя Беларусі можа быць упісана ў рамкі марксісцка-савецкай перыядызацыі. Аўтар цалкам капіраваў падыход даследавання савецкіх гісторыкаў, што абумовіла недахопы кнігі. Выкарыстанне марксісцка-савецкага падыходу абумовіла і спецыфіку пабудовы наратыву выдання. Асноўны акцэнт рабіўся на дзейнасць партыі бальшавікоў, рэвалюцыйным і пралетарскім руху.

Гісторыя спробы стварэння беларускай дзяржаўнасці ў пачатку ХХ ст. разглядаецца ў раздзеле «У пачатку ўласнай дзяржаўнасці». Згодна савецкай гістарыяграфічнай традыцыі праблема разглядалася Косманам праз прызму супрацьстаяння савецка-бальшавіцкага і нацыяналістычна-буржуазнага падыходаў.

Беларускі нацыянальны рух характарызаваўся як рэакцыйны, антысавецкі, антыпольскі і інспіраваны нямецкай прапагандай. Спробу стварэння БНР аўтар характарызаваў як нязначную. На яго думку, ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці была не прынята ні немцамі, ні беларускім народам, у першую чаргу сялянамі, і з’яўлялася праектам беларускіх буржуазна-інтэлігенцкіх дзеячаў. Аўтар адзначае, што немцы фактычна трымалі ўладу ў сваіх руках, кідалі ў турмы беларускіх інтэлігентаў, не жадалі ўзмацнення БНР і яе збліжэння з Літвой. Нягледзячы на гэту характарыстыку, беларускі нацыянальны рух Косман называў пранямецкім і нацыяналістычным [1, с. 289–290].

Характарызуючы паўстанне беларускай савецкай дзяржавы, М. Косман выводзіць гэта рашэнне з цяжкай палітычнай і гаспадарчай сітуацыі бальшавікоў і ўмоў мірнага пагаднення ў Брэсце. Умовы міру з немцамі часткай партыі былі ўспрыняты як капітуляцыя перад ворагам. У выніку было прынята рашэнне аб стварэнні новых рэспублік, што азначала разрыў з нацыянальнай палітыкай царскай Расіі [1, с. 292]. Праца Космана не згадвае ні Першы Усебеларускі з’езд, ні ўстаўныя граматы БНР.

Аналізуючы польскія канцэпцыі вырашэння беларускага пытання, аўтар робіць акцэнт на буйным польскім землеўладанні і яго інтарэсах, а адроджаную польскую дзяржаву называе буржуазна-абшарніцкай. З тэксту раздзела вынікае, што канцэпцыю аб’яднання Літвы, Польшчы, а таксама Віленшчыны і Гродзеншчыны прапаноўвала французскае Міністэрства замежных спраў на падставе матэрыялаў Нацыянальнага камітэту Р. Дмоўскага [1, с. 293]. У тэксце выдання можна знайсці згадкі аб краёўцах, якія імкнуліся стварыць «літоўскую дзяржаву», якая павінна была б мець літоўска-польска-беларускі характар. У цэлым тэрытарыяльныя прэтэнзіі польскай дзяржавы, на думку Космана, тычыліся Мінскай і Віленскай губерняў. У гэтых умовах Віленская беларуская рада імкнулася стаць адзіным рэпрэзентантам беларускай справы і звярталася да Пілсудскага з просьбамі аб адбудове незалежнай беларускай дзяржавы, звязанай з Польшчай [1, с. 296].

Стварэнне Літоўска-беларускай ССР Косман абумоўлівае гістарычнымі сувязямі і памяццю аб спадчыне ВКЛ. Але непасрэдна праект стварэння ЛітБел абумоўлены складанай міжнароднай сітуацыяй і пагрозай з боку Польшчы.

Польска-савецкая вайна трактавалася з класавых пазіцый і сцвярджалася, што польскае войска абараняла інтарэсы памешчыкаў і абшарнікаў. Паводле федэрацыйнай канцэпцыі Пілсудскага Вільня павінна была застацца цэнтрам польскасці, а Мінск стаць беларускім цэнтрам усходніх зямель. Беларускае пытанне разглядалася з перспектывы мачымых саступак у культурным развіцці, але не ў сферы палітыкі [1, с. 299]. Косман падкрэслівае, што і Пілсудскі лічыў непатрэбным ствараць «беларускую фікцыю», і нацыянальныя-дэмакраты сцвярджалі, што на так званай “Беларусі” будзе або польскасць, або расійскасць, падтрымка беларусізму толькі штучна яго ствараe» [1, с. 300].

Раздзел, прысвечаны становішчу БССР і Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, атрымаў назву «Міжваенны перыяд: два шляхі развіцця 1921–1941». Згодна ідэалагічнай схеме, працэсы, што адбываліся ў БССР і СССР, ацэньваліся станоўча, а пры аналізе становішча заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы падкрэслівалася каланізацыйная палітыка ўлад, але ў той жа час адзначалася нізкая якасць кадраў, якія накіроўваліся туды на працу з цэнтральнай Польшчы, і ўвогуле адсталасць трох паўночна-ўсходніх ваяводстваў. Маладая польская дзяржава імкнулася ажывіць эканамічнае жыццё ў рэгіёне, але беспаспяхова. Дзейнасць партый Заходняй Беларусі паказана на прыкладзе КПЗБ і «Грамады», якія паслядоўна адстойвалі «рэалізацыю ленінскай нацыянальнай лініі». Характэрна, што згадваецца Б. Тарашкевіч, які быў «асуджаны на падставе фальшывых абвінавачванняў разам з іншымі камуністамі ў 1937 г. і рэабілітаваны пасля ХХ з’езда КПСС» [1, с. 331]. У наратыве гісторыі БССР міжваеннага перыяду згадкі аб палітычных рэпрэсіях адсутнічаюць.

Пачатак Другой сусветнай вайны даецца ў савецкай трактоўцы, што Заходняя Беларусь стала аб’ектам атакі гітлераўскай Германіі і 17 верасня 1939 г. Чырвоная армія запэўніла бяспеку беларусам і ўкраінцам [1, с. 331]. Хатактэрна, што раздзел прысвечаны вайне атрымаў назву «Другая сусветная вайна 1941–1945», а само паняцце «Вялікая Айчынная вайна» ў тэксце не ўжываецца.

Апошні раздзел «Аднаўленне краю і стварэнне асноў камуністычнага грамадства» атрымаўся вельмі абмежаваны і датычыўся некалькіх пасляваенных гадоў [4, с. 693]. Раздзел утрымлівае аўтарскае абагульненне гістарычнага вопыту беларускага народу. Косман адразу сцвярджае, што Беларусь ніколі не мела ўласнай дзяржаўнасці і адпаведна «палітычнай гісторыі», а ўсе спробы яе стварэння былі знішчаны больш моцнымі суседзямі. Існаванне побач з Беларуссю моцных дзяржаваатворчых цэнтраў – кіеўскага, літоўскага, польскага і маскоўскага – вяло да захопніцкіх памкненняў і сацыяльна-эканамічнага ўціску ва ўмовах феадальнага і капіталістычнага ладу. Толькі сацыялістычны лад і ўласная дзяржава стварылі ўмовы для нацыянальна-культурнага развіцця [1, с. 366–368].

Выданне М. Космана «Гісторыя Беларусі» з’яўляецца прадуктам свайго часу. Цэнзурна-ідэалагічныя абмежаванні, якія існавалі ў Польскай народнай рэспубліцы, асабліва датычныя інтэрпрэтацый гісторыі ХХ ст., абумовілі адлюстраванне скажонага гістарычнага наратыву праблемы гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Адзіная сінтэтычная праца па гісторыі Беларусі перыяду ПНР была абцяжарана шматлікімі недахопамі, памылкамі, змаўчаннямі. У цэнтр увагі быў пастаўлены класавы падыход, які абумовіў пабудову наратыву выдання. Пры апісанні гісторыі Беларусі ХХ ст. хутчэй мова ішла аб гісторыі бальшавізму ў Беларусі. У той жа час у працы адсутнічаюць тыповыя вызначэнні характэрныя для савецкага наратыву, напрыклад, паняцце «Вялікая Айчынная вайна». У выданні амаль не выкарыстоўваецца паняцце «крэсы», толькі ў негатыўным аспекце, як поле канфліктаў і каланізатарскай палітыкі ўлад, і ўжываецца паняцце «Заходняя Беларусь», што практычна немагчыма сустрэць у сучасных польскіх выданнях. М. Косман будучы спецыялістам па гісторыі ВКЛ, відавочна пры напісанні гісторыі Беларусі ХХ ст. у значнай ступені абапіраўся на савецкія выданні, што абумовіла пэўныя запазычанасці з абагульняючых прац па гісторыі БССР. Як адзначаў сам аўтар: «Не дэманізуючы забароны, трэба сказаць коратка: чым бліжэй да сучаснасці, тым больш у 1976–1977 гг., калі пісалася кніга, трэба было лічыцца з неабходнасцю апускаць некаторыя пытанні, а нават – у выніку ўласных думак і прапаноў рэцэнзентаў, якімі былі прафесары Л. Базылоў і Е. Ахманьскі – выдалення цэлых старонак у машынапісным тэксце. Выдаленняў было шмат. Пры выдаленні аднаго, часта прыходзілася адмовіцца ад другога, асабліва ў выпадку канфліктных пытанняў, што раздражнялі ідылію – бо так хацелі палітыкі – атмасферу гарманічнага пасляваеннага супрацоўніцтва» [5, с. 95]. Косман прызнаваў, што другая частка, якая ахоплівала апошнія паўтары стагоддзі была перапісана занава.

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Kosman, M. Historia Białorusi / M. Kosman // Wrocław – Warszawa – Kraków – Gdańsk : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1979. – 404 S.
2. Siekierski, M.Historia Białorusi by Marceli Kosman // The Polish Review. – Vol. 27, No. 1/2 (1982). – P. 176–178.
3. Grygajtis, K. «Historia Białorusi» Marceli Kosman, Wrocław 1979 : [recenzja] // Przegląd Historyczny. – 1981. – №72/2. – S. 323–325
4. Wojna, R. Dwie syntezy dziejów Białorusi / R. Wojna // Kwartalnik Historyczny. – 1980. – № 3/4. – S. 693–700.
5. Waszkiewicz, J. Polska historiografia dziejów Białorusi w latach 1945–1991 / J. Waszkiewicz // Dzieje Najnowsze. – 1999. – № 31/1. – S. 85–102.


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова